Беларускі шлях

Адрас рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухсуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.
Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і карэспандэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 5 рублі.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб. на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 33. Менск. Серада 1 мая 1918 г. Год I

Менск 1/v.

Творчыя сілы.

У Віленшчыне і у Меншчыне па валасьцех самі селяне заводзяць парадак. Без почты акуратных вестак німа, але с тых, каторыя выпадкова даходзюць да нас, на душы робіцца вяселей. Па валасьцех выбіраюць селяне інтэлігэнцыю, каб ее розум і навука ішлі па здбудаванне краю. Край увесь засеваецца поуным ходам. Восень,—новы ураджай ужо будуць першым моцным брокам па дарозе да нормальнаго стану Беларусі. У Радзе Рэспублікі адбіваецца, як у люстры коаліцыя і творчая праца валасьцеу. Рада прыймаець адважныя настуні і рашэнні, каб з'арганізаваць ні толькі волосьці, але увесь комплекс солідарнасьцяу, с каторых складаецца уся Беларусь.

Беларускі народ гэта—спакойныя людзі з гаспадарным складам характэру і старой культурай моцных традыцый. Жыцце і натура рэчэй вымагаець стварэння нормальнаго дзержаўнаго мэханізму. Сілау для гэтаго у нас па усяму краю, як практыка паказвае, есьць досыць. Ні хапае ім толькі агульнай сыстэмы.

А далейшая праца па нормаванню края усе роўна будзе шукаць формы, бо унутраннi зьмест для формы ужо есьць.

Мы верым, што скора выклярусцца усе як найлепш.

Беларусы там.

У Смаленску зьбіраецца большэвікамі зьезд беларускіх валасных «саветоу» Смаленшчыны, Вітэбшчыны і Могілеушчыны. Хаця у «саветах» заседаюць шмат расійскіх салдатоу, тамтэйшай арміі, але усе-ж, можа, там праб'юцца галасы беларусау з-за спін «таварышоу» з Масквы.

З розных вестак відаць, што у нашым Смаленску у тамашніх жыхароу такі самы настрой, які быу у Менску у астатнія часы, мінчукі чуліся, як пад татарскім ярмом, чакаючы калі гэтыя «штыкі» «боты» і Ляндэры і розныя чужынцы выедуць куды далей. Ізаліраваннасьць «большэвікоу» ад прадвечных жыхароу была самая рэзкая.

Мы павінны пусьціць усе нашыя сілы, каб ачысьціць заоршанскую Беларусь ад наезжай і чужой ей салдацкай пугачоушчыны. Гэтаго вымагаюць нацыянальна-дзержаўныя беларускія інтарэсы і яе нізалежнасьць.

Каб у часе Бярэсьцейскіх трактатау большэвікі-цэнтралісты ні разагналі Усебеларускаго Конгрэсу і ні адсунулі сілаю штыкоу беларусау ад учасьця у мірных умовах,—доля Беларусі пайшла-бы другой дарогай.

Прылучэнне да рэшты Беларусі нашай заоршанскай часьці будзе тагды, калі у Менску створыцца праудзівая дзержаўнасьць Беларускай рэспублікі.

Абразкі с правінцыі.

(Па даугінаускаму гасьцінцу.)

Водаль ад вёскі, на ўзгорку ля выгану стаіць народная школа. Школьныя інваліды-скамейкі разломаныя, накалечаныя стаяць і лежаць на дзядзінцу. Ля хлева у лужыне гніюць сьляды граматнасьці,—разорваныя школьныя спадручнікі. Лепшыя кніжкі са школьнай бібліатэкі забралі гаспадары на «цыгаркі». Паркан згніў і паваліўся, цэлікам уросшы у зямлю. Маладыя дрэўцы паломаны. Пасуцца на дзядзінцу гусі, а босыя пастушкі с сукаватымі палкамі вылаўліваюць з гразнай лужыны плывучую навуку — астаткі хрэстаматыі, лісты з малюнкамі. Натта ужо любяць пастушкі малюнкі..

Чытаць то ім ні у магату— ўсяго адну зімку вучыліся. Потым вучыцель пашоў на вайну і нешта аттуль ні вярнуўся ..

Стануць дзеці на падмуроўцы ды паглядаюць праз вакно у глыб пакоў: Пустата, пыл, павуціна... і ні можа утрымацца малы галапуп, каб ні сьвіснуць, што рэхі аж покатам коцюцца па усіх пакоях,

Гулка, зычна і забаўна...

А на сьценах дрыжаць ад ветрыка ласкуты мапаў гэаграфічных. А на бруднай падлодзі валяюцца блешанкі ад кансэрваў, бутэлькі с пад шампанскаго... Шмат вясёласьці, шмат руху, шмат вялікіх разгулаў бачылі гэтыя школьныя пакоі за час вайны: Шайкі казакоў часам тут гульні сваe ладзілі. Афіцэры с сёстрамі тут балевалі. Бравaркі часам устраіваліся. Пітацельныя пункты разных «земсаюзаў» і «сьверо-помощи» тут гнёзды свае вілі. Колькі часу тут быў і шпыталь земсаюзны. Праўда, стогнаў і плачаў ні чуваць было, бо бывало ўсяго два або тры хворых. Затое было шумно: штат служачых з 27 чалавек, 12—коней—гэта ні іголачка якая.

Затое вясковыя людзі час-ад-часу мелі заработкі. Гэто было тады, калі спадзеваліся і чакалі рэвізыю. Тады доктар клікаў чалавек дваццаць вясковых абібокаў. Апранываў іх у шпітальныя халаты, укладываў на сьвежанькія койкі карміў іх два або тры дні па праграмме шпітальнай дыэты (белы клеб, яйкі, масло, малако і катлеткі), а у дадатак іншчэ без грошавога ганарару «хворые» са шпіталю ні выпускаліся...

Вось гэтакія камэдыі памятае нішчасная школа...

* * *

А польскія школкі з наўчыцелькамі с царства польскаго расьлі, як крыбы... Нават і праваслаўныя дзеці вучыліся там.—Нехай хоць па польску вучацца, калі другіх школ і вучыцялёў німа!—апраўдываліся бацькі.

На сьпеўках у школах бываець і дарослая моладзь і нават сталыя кабеты прыходзюць. Сьпеваюць большую частку патрыятычныя песьні, як: «Z dymem pozarow...», Boże cós Polska». і др.

* * *

Дзед, хмуры с сівымі вусамі сядзіць на пяколку і скоса паглядае на ўнучку сваю, што сядзіць над кніжкай ля стала і старанна шалоча.

— Відаць, дзеткі, як жбу любіш болей ўсяго на сьвеці,—кажа дзед, выймаючы люльку з зубоў.

— Но-но, дзядок, болей ўсяго на сьвеці я люблю Варшаву...—кажа дзяўчына і гарда блішчаць яе вочкі ад пэўнасьці вялікай асьветы.

Дзед бярэцца зноў за люльку, зацягваецца дымам, злосна плюе, робіцца вельмі пахмурным і нічога болей ні пытаецца у сваей ўнучкі...

З. Бядуля.

„Беларускі кангрэс".

(матэр'ялы і дакумэнты).*

Падамо тутака іншчэ тры дакумэнты да гісторыі 1 Усебеларускаго з'езду 5—15 сьнежня.

Пасля пастановы Вялікай Рады склікаць З'езд на 5 сьнежня большэвікі устрывожыліся «Рада Народных камісарау заходняй обласьці і фронту» на чале с «т.» Ляндэрам схапілася за «рашучыя» заходы, каб нідапусьціць з'езду. Менск быу аб'яулены у ваенным стане. Запрацавау урадавы тэлеграф адбіваючы цыркулярную тэлеграму:

ТЕЛЕГРАММА ВОЕННАЯ внѣ очереди циркулярно.

Изъ Минска.

Во всѣ почтово-телеграфныя учрежденія Минской и Виленской губерніи Уѣзднымъ крестьянскимъ уѣзднымъ комитетамъ волостнымъ земствамъ уѣзднымъ и заштатнымъ городамъ уѣзднымъ земельнымъ комитетамъ уѣзднымъ учительскимъ союсамъ учительскимъ Совдепамъ уѣзднымъ кооперативамъ Минской и Виленской губерніи.

Ввиду военнаго положенія всякаго рода съѣзды въ городѣ Минскѣ и раіонѣ Западнаго фронта по приказу Главкозапа и Ревкозапа воспрещены.

Совѣтъ Народныхъ Комиссаровъ западной области.

У часе пасядзэнняу з'езду над ім чувало „нідрамлівае воко" большэвікоу і ма—быць ні без загаду с Пецярбургу, як аб гэтым можна зрабіць высновак с такой тэлеграмы з Менску: (Даты німа, але павінна быць ад 7 сьнежня).

ТЕЛЕГАРММА

СТАВКА Главковерх ПЕТРОГРАДЪ Правительство Народныхъ Комиссаровъ

Украинская рада Запфронта арестована *Сообщите дальнѣйшемъ направленіи дѣлъ и судьбы арестованныхъ точка* Украинскіе эшелоны разоружаются и направляются въ тылъ точка *За остальными радами* и Довборомъ *неослабный надзоръ*

Предсѣдатель Областного Совѣта Комиссаровъ **Ландеръ.**

Страшнае злочынства над Беларускім народам было аднак ні легкай справай для сумлення нават і „т. т. народных комісаров" ад «Ревкозапа". На нейкі час ім захацелося схаваць ад сьвету учыненую збродню. І вось, калі ужо прэзыдыум з'езду вялі у астрог, з габінэту К. Ляндэра у „Камэрчэскім - Смольным" перадавалася такая тэлефонограмма:

«Правительственному телеграфу

ТЕЛЕФОНОГРАММА

№ 492.

Отъ Совѣта Народныхъ Комиссаровъ Зап. Области

дана 18 декабря въ 5 ч. утра

Запрещается въ теченіи 24 час. со времени передачи этой телефонограммы принимать и передавать по аппаратамъ всякія сообщенія и свѣдѣнія, носящія общеполитическій характеръ, отъ кого бы они ни исходили, кромѣ телеграммъ, отправленныхъ за подписью и съ печатью Сов. Нар. Комиссаровъ Зап.-Области. *Въ частности запрещается передача всякихъ свѣдѣній о бѣлорусскомъ съѣздѣ и бѣлорусской Радѣ.* Всякія нарушенія будутъ караться по всей строгости военно - революціоннаго времени.

Предсѣдатель областного Совѣта Народныхъ Комиссаровъ К. И. Ландеръ.

Управляющій дѣлами Совѣта Осиповъ».

Камісары спадзеваліся што у 24 гадзіны яны ліквідуюць нават—самую памяць аб «бѣлорусскомъ съѣздѣ и бѣлорусской Радѣ»...

А. Н—і.

*) Гл. №№ 25, 26, «Белар. Шлях».

МАЛЕНЬКІ ФЭЛЬЕТОН.

БАТЛЕЙКА.

Вялікая саля. Шмат публікі. На стале на відочным мейсце стаіць батлейка. На сцэну выходзіць селянін-беларус у лапцек.

Беларус *(с крыудай)*:

Суседзі, суседзі,
Ні рэжця мяне,
Бо Божанька угледзя,—
Караць вас пачне!
У вас апэтыты
На гоню маю
І я, як забіты,
Маучаць ні магу.
Зямелька мая тут
Спрадвеку ляжыць.
Хадзяінам я тут,—
І я хачу жыць...

На сцэну выходзяць п. Стэчковскі і увесь «габінэт». Пан Стэчковскі і члены „габінэту" Разам:

Ад мора да мора
Абшары, краі,
Даміны і горы,—
Усе польскай зямлі!
Да Польшчы прылучым!
Німа нам граніцы!
Па-польску навучы[м]
Усіх гаварыці!!

На сцэну выходзіць п. С[мэ]тона.

п. Смэтона:

О нас гэтак мала,—
Кажу я усім,—
Мы згінем памалу,
Мы згінем зусім...
Адыно лекарство
Ад гэтакіх ліх,—
Літоускае царство
На землях чужых!

На сцэну выходзіць украінскі с.-д.

Украінскі с.-д.:

Усе нас кахалі
За песьні у цішы.
Нам шчасьця жадалі
Ад шчырай душы.
Цяпер, калі сьмела
Шагнулі мы крок,
Бярэмся за дзело,—
Сумленне на бок..

Батлейшчык ад сябе:

Ні вадзьцеся людзі,
А то горэй будзе,
Як прыдуць ад Тулы
З нажамі камулы.
Пачнуць сеяць „волю",
Крывей гнаіць поле...

* * *

На сцэне шум і завіруха.

З. Б.

МАЙ.

З яркім сонцам,
С пукам красак
Май да нас ідзець.
З зыкам птушак,
С коўдрай руні
Песьні нам пяець.

* * *

Гэй, багаты і убогі,
Куйце новыя нарогі
Са штыхоў, мечоў!
Заваюйце ў родным полі
Колас шчасьця колас волі,—
Май да нас прышоў!

* * *

Хлебаробы і ратаі,
Вашэ сьвято—сьвято Мая,
Сьвято ніў, палей,
Паласкі зямелькі-маці
Трэба пільна заараці,
Засеваць хутчэй!

* * *

Зарастуць травой магілы;
Мы адновім нашы сілы,
Адбудуем край.
Буйны колас закрасуе.
Беларусь уся хай чуе,
Што сьвяткуем Май!

Ясакар.

Агульныя весткі.

— РОТТЭРДАМ 27 IV. Паведамляюць з Вашынгтону аб забароні Галяндзкій вывазу з Галяндскай Ост-Індыі руды, волава, хіннай кары, хіны і тутуну,—патрэбных для ваенных мэтаў Злучаным Штатам.

— ЖЭНЭВА 27 IV. Фр. газ. «Iournal» паведамляе аб магчымасьці паўстання у Марокко, якое можа быць у скутку нямецкіх пабедаў. Баяцца злучэння усіх шайкаў пад даводство быўшаго султана Гайзулы. На лінію Таза-Фэс штодзенна робяцца напады.

— БЭРЛІН 27 IV. Узятыя пры Вільо-Брэтонне вучні ангельскай школы авіяцыі у веку ад 17 да 19 гадоў расказалі што з іх школы было узято і выслано пад Калэ 1000 вучняў школы.

— МАСКВА IV гм. Пасол Бэльгіі, д'Эстрэ, які знайходзіцца цяпер у Валогдзе ў размові с коррэспондэнтамі газэт паміж іншым сказаў: «На нішчасьце мы павінны перакапацца, што а ні у перагаворах, ані ў самым мірным трактаце паміж цэнтральнымі дзяржавамі і Расіяй, Расія ні чым ні прыпомніла сваіх абавязкаў да нас, хаця гэтыя абавязкі пакладаліся на яе умовай, што цэлых сто гадоў карысталася прызнаннем усяго сьвету».

НЬЮ-ЮРК. 26 IV. Як паведамляе «Рэйтэр», каб павялічыць транспорт войскаў у Эўропу, вайсковы дэпартамэнт будуе шмат докаў і складаў у італьянскіх гаванях і пэўне адкупіць некалькі докаў у прыватных асоб.

БЭРН 27 VI. Пры адчыненні французскай рады гэнэралаў нікаторыя з міністраў гаварылі прамовы. Клоц (фінансаў) казаў, што мір, згодны для Францыі,—гэта такі мір, каторы верніць Францыі гвалтам ад яе атарваныя правінцыі і згладзіць усе крыўды учыненыя ей. Нээ (юстыцыі) выказаўся аб тым, што увайшлі у апошнюю фазу вайны. А перамога можа быць тады, калі будуць спакойны, церпялівы і злучны.

БЭРЛІН 27 IV. Дысцыпліна паміж чорнымі войскамі у Францыі так запсулася, што Клемансо перамог сваю нявавісьць да клерыкалоў і адкамандіраваў у лагеры нэграў місыянэра, каторы добра ведае характар сэнэгальскіх нэграў. Місыянэр мае выслухаць усе жаданні нэграў і заладзіць ніпаразуменні.

РОТТЭРДАМ 27 IV. Як паведамляюць ангельскія газэты, запісаны паміж апошвіх стратаў ад 6 да 16 красавіка 3600 афіцэраў.

БЭРН 27 IV. У канфлікце паміж Вільсонам і Сэнатам наступіў крызыс. Сэнат ні хоча даць Вільсону належачаго поўнамоцтва. Наадварот—сэнат хоча яшчэ звузіць і тое поўнамоцтва Вільсона, якім ен карыстае цяпер. У лісьце Вільсон энэргічна паведаміў, што ен ні пойдзе ні на якія уступкі.

Весткі з Расіі.

— 22 красавіка Савецкім Урадам у Маскве выданы дэкрэт аб нацыяналізацыі заграцічнаго гандлю. Подлуг дэкрэту купоўля і прадажа усякіх прадуктаў (дабываючай, выраблюючай прамысл. с.-гаспадаркі і інш.) з другімі гасударствамі і прыватнымі гандлёвымі прэдпрыемствамі за граніцай робіцца ад імені Расійскай рэспублікі асобна на гэта упаважненымі органамі. Памінаючы гэтыя органы, усякі прыватны гандэль забараняецца. Для ўвозу і вывазу пачтавых пасылак і пасажырскіх рэчаў маюць быць выданы асобныя правілы.

У арганізацыі усяго дзела прыймуць учасьце прэдстаўніцтва ад ўселякіх народна-гаспадарчых установаў: коопэрацыі, «саветы» гаспадаркі, «саветы» міністэрстваў, «Цэнтрочай», «Главсахар» і. г. і.

— Аснаўныя пункты праэкту Троцкаго, аб арганізацыі новай «работніцка-селянскай арміі» прыняты цэнтральным выканаўчым камітэтам. У найблізшым часе чакаецца дэкрэт аб агульнай работніцка-селянскай рэкрутскай павіннасьці.

— На пераездзе «Кашира»—«Ожерелье» Рязанска-Уральскай ж. д. 5 чалавек грабежнікаў з бомбамі і рэвальвэрамі ўварваліся у пачтовы вагон і узялі з вагону 9 мільёнаў рублёў, якія напраўляліся з Масквы у Тамбоў.

— Маскоўскі абласны харчовы камітэт атрымаў весьць с Малкоўкі, і з Шахоўской, Сцепурына і Быхова, ў районе Маск, губ., што у гэтых мейсцох пачаўся голад. Людзі ні маюць мукі. Жывацiна ні ходзіць за нідастаткам корму.

— У Маскве выдаецца чверць фунта «саламянаго» хлеба на чалавека. Дазволяна прывозіць с сабой муку у пасажырскіх цягнікак. За прывезеную гэтым спосабам муку бяруць: жытнюю—150 р. п., «мягкую»—200 рб., крупчатку—250-270 рб. пуд.

— Ноччу 23 красавіка у Пецярбургу ліквідаваліся арганізацыі анархістаў, выкліканыя данымі атрыманымі ў рэволюцыйным штабе, што анархісты гатуюцца к бунту. Пры ліквідацыі цэнтральнаго штабу анархістаў і районных кватэраў узято шмат вінтовак, набояў, кулямётаў і харчовых прыпасаў. На латышскіх стральцоў якія адвозілі на грузавых самаходах адабраныя бронь і прыпасы, было зроблено нескольк[і] нападоў группамі анархістаў, для разгону якіх пушчаны быў адзін пусты набой з гарматы.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоўнаг[о] камандавання за 30 красавіка 1918 року.

З А Х А Д: У Фляндрыі у нікаторых мейсцох разьвіваліся моцныя пяхотныя бае. Паўночней Вэрмезееле Грост—Фірстраат мы занялі нескольні ангельскіх ямаў. Каля Локкера нашыя штурмавыя атрады зустрэліся з моцнаю контр-атакаю французаў. У часе гэтых баеў ніпрыяцель ухітраваўся ўмацавацца ў Локкеру. Яго пробы прарвацца за рубяжы мястэчка, пацярпелі піўдачу, Дужая артылерыйская дзейнасьць пашыралася на ўвесь вучастак Кеммелю і цягнулася да цемнаты. Больш на фронці баевая дзейнасьць абмежоўвалася разьведкамі і часамі рухавым артылерыйскім агнем.

Македонскі фронт.

Між Вардарскім і Дойранскім вазерамі ніпрыяцельск[і] напад, пасьля многаднеўнаі артылерыйскаі падгатоўкі, бы[ў] зломаны перад нашымі акопамі.

Першы-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Выплата пэнсыі за красавік упрауленнем служачым Л. р. ж. д. будзе у канцы гэтаго тыдня. Гэта другая і апошняя выплата пасьля акупацыі краю с тутэйшых упрауленскіх грошай. А пуцевым служачым пэнсыя пойдзе з нямецкай скарбніцы.

А упрауленцы массамі ішчэ пакідаюць Менск і едуць у Маскву да «савецкіх» камісарау на абецанкі—цацанкі.

Другое бекавое бюро адчынілося нарэшці. Мо яно скароціць хвасты,—дауно пара. А вось у самых крамах (100) то ішчэ вялікая ніупраука і нізауседы капаець хлеба на боны.

Норміроука маса пачнецца с 11-го мая. С пачатку будуць выдаваць на 1 чалавека у тыдзень $^5/_8$ ф. да 1 ф. па цане ні болей 2 руб. Рэквізыцыя мяса усіх сортау для гар. управы пачалася 30 красавіка. Запасы мяса, выключаючы сьвежаго, болей устаноуленай нормы (да 5 фун. рускай вагі на чалавека) ад 1-го па 10-е мая павінны быць зданы у 28 еурэйскіх пунктау, 15 хрысьцыянскіх і у скотабойню. Ад 2 мая мяснікам і коубаснікам забараняецца прадажа мяса, выданаго горадам. Рэстараны павінны да 7-го мая выраходаваць мясо, пасьля па картачкам.

Нідахват грошай у местовай управе вельмі моцна адчуваюць служачыя управы. Настрой у іх ніважны.

Чырвоны крыж намінальна канчае сваю ліквідацыю 1-го мая.

Праваслаунае духоунае ведамство церпіць грашавыя нідахваты. Ад 1-го марца пэнсыя с казны ні выдаецца. Дзеля гэтаго павялічана арэндная плата на зямлю. Але кішэн арэндатарау—вельмі слабыя латы для грошавых справ вышэпамяненаго ведамства. У скарбонкі так сама скупа падае.

Збор у карысьць беларускіх культурных арганізацыяу, адбыушыся 7-го г. красавіка, дау 1032 р. 31 к.

Найвялікшая сума аказалася у скарбонцы № 4 (142 р 56 к.)

Старшыня арганізацыйнай Камісыі па збору

К. Езавітау.

«Вольная Беларусь». № 15 вышау 28-го красавіка г. м. Зьмест такі: К Богу Праведнаму, верш Ц. Гартнаго; Верш Макара Беларусь і Украіна, Я. Лесіка Забыты шлях, М. Богдановіча Хараству. верш Ясакара; Я[к] дзядзька езьдзіу у Вільню што ен там бачыу, верш—апаведанне Я. Коласа; Кроніка вершы і др. Цана асобнаго № 30 к.

Цэны за апошні дзень:

Сьметана — 6 р. кварта.
Курыца — 25 р. штука.
Чорны хлеб (астатні у прыватных крамах)—1 р. 80к.—1 р. 60 к. фунт.

Курсы беларусознауства.

1 Мая Лекцыя Язэпа Лесіка: «Гісторыя Князьства Літоускаго». Пачатак а 7 гадз.

Рэдактар А. Прушынскі

Выдавецтво Т-во «Заранка».

АБВЕСТКА.

Ад 2 Мая да 15 Чэрвеня г. р. будзе заведзена лоўля сабакаў ў межах гораду Менску. На працягу гэтаго часу ўсе сабакі ў гор. Менску павінны быць на прывязі і на вуліцах павінны вадзіцца на прывязі. Бегаючыя вольна па вуліцах сабакі будуць адразу злоўлены і забіты

Менск 1 мая 1918 р.

КОМЭНДАНТ
фон-Франканбэрг.
ПАЛКОУНІК

Друкарня Я. А. Грынблата.